Прысну море полунощи; идутъ сморци мьглами. Игореви князю богъ путь кажетъ изъ земли Половецкой на землю Рускую, къ отню злату столу. Погасоша вечеру зари. Игорь спитъ, Игорь бдитъ, Игорь мыслію поля меритъ отъ великаго Дону до малаго Донца. Комонь въ полуночи Овлуръ свисну за рекою; велить князю разумети. Князю Игорю не быть! Кликну; стукну земля, въшуме трава, вежи ся половецкіи подвизашася. А Игорь князь поскочи горнастаемъ къ тростію и белымъ гоголемъ на воду. Въвръжеся на бръзъ комонь и скочи с него босымъ влъкомъ. И потече къ лугу Донца, и полете соколомъ подъ мьглами, избивая гуси и лебеди завтроку и обеду и ужине. Коли Игорь соколом полетє, тогда Влуръ влъкомъ потече, труся собою студеную росу; претръгоста бо своя бръзая комоня.

Донецъ рече: «Княже Игорю! Не мало ти величія, а Кончаку нелюбія, а Руской земли веселіа» .Игорь рече: «О, Донче! не мало ти величія, лелеявшу князя на влънахъ, стлавшу ему зелену траву на своихъ сребреныхъ брезехъ, одевавшу его теплыми мъглами подъ сенію зелену древу; стрежаше его гоголемъ на воде, чайцами на струяхъ, чрьнядьми на ветрехъ». Не тако ли, рече, река Стугна; худу струю имея, пожръши чужи ручьи и стругы, ростреиа къ устью, уношу князю Ростиславу затвори Днепрь

рано кукует: «Полечу, говорит, кукушкой по Дунаю, омочу бобровый рукав в Каяле реке, утру князю кровавые его раны на могучем его теле».

Ярославна рано плачет в Путивле на стене, причитая: «О, Ветер, ветрило! Зачем, господин, бурно веешь? Зачем несешь вражеские стрелы на своих легких крыльях на воинов моего милого? Мало ли тебе было в вышине под облаками веять, качая корабли на синем море? К чему, господин, мое веселие по ковылю ты развел?»

Ярославна рано плачет в Путивле городе на стене, причитая: «О, Днепр Словутич! Ты пробил каменные горы сквозь землю Половецкую! Ты качал на себе Святославовы насады до стана Кобякова. Прикачай, господин, моего милого ко мне, чтобы не посылала к нему слез на море рано!»

Ярославна рано плачет в Путивле на стене, причитая: «Светлое и пресветлое Солнце! Всем тепло и прекрасно ты. Зачем, господин, простерло жгучие свои лучи на воинов милого? В степи безводной жаждою им луки свело, истомою им колчаны заткнуло».

Заплескало море в полночь; идут смерчи мглою. Игорю князю бог путь кажет из земли Половецкой в землю Русскую, к отчему престолу золотому. Погасли вечерние зори. Игорь спит, Игорь не спит, Игорь мыслью степь измеряет от великого Дона до малого Донца. Коня в полночь Овлур свистнул за рекою; велит князю догадаться. Князя Игоря нет! Кликнул. Загудела земля, зашумела трава, шатры половецкие заколыхались. А Игорь князь поскакал горностаем к камышу и белым гоголем на воду. Кинулся на борзого коня и соскочил с него белым волком. И понесся к лугу Донца и полетел соколом под туманами, избивая гусей и лебедей к завтраку, обеду и ужину. Коли Игорь соколом полетел, то Овлур волком понесся, отрясая собой студеную росу: притомили ведь они оба своих борзых коней.

Донец сказал: «Князь Игорь! Не мало тебе величанья, а Кончаку досады, а Русской земле веселья!» Игорь сказал: «О, Донец!

темне березе. Плачется мати Ростиславя по уноши князи Ростиславе: «Уныша цветы жалобою, и древо съ тугою къ земли преклонилось».

А не сорокы втроскоташа, на следу Игореве ездитъ Гза съ Кончакомъ. Тогда врани не граахуть, галици помлъкоша, сорокы не троскоташа, по лозію ползоша только. Дятлове тектомъ путь къ реце кажутъ, соловіи веселыми песьми светъ поведаютъ. Млъвитъ Гза къ Кончакови: «Аже соколъ къ гнезду летитъ, соколича ростреляеве своими злачеными стрелами». Рече Кончакъ ко Гзе: «Аже соколъ къ гнезду летитъ, а ве соколца опутаеве красною девицею». И рече Гза к Кончакови: «Аще его опутаеве красною девицею, ни нама будетъ сокольца, ни нама красны девице, то почнут наю птици бити въ поле Половецком».

Рекъ Боянъ на ходы на Святъславля, песнотворецъ стараго времени Ярославля, Ольгова, коганя: «Хоть и тяжко ти, голове, кроме плечю; зло ти, телу, кроме головы»; Руской земли безъ Игоря. Солнце светится на небесе, Игорь князь въ Руской земли. Девици поютъ на Дунаи, вьются голоси чрезъ море до Кіева. Игорь едетъ по Боричеву къ святей богородици Пирогощей. Страны ради, гради весели.

Певше песнь старымъ княземъ, а потомъ молодымъ пети: «Слава Игорю Святъславличю, буй туру Всеволоду, Владиміру Игоревичу. Здрави князи и дружина, побарая за христьяны на поганыя плъки! Княземъ слава а дружине». Аминь.

Не мало тебе величанья, что качал князя на волнах, постилал ему зеленую траву на своих серебряных берегах, одевал его теплыми туманами под сенью зеленого дерева; стерег его гоголем на воде, чайками на струях, чернядьми на ветрах». Не такова-то, говорят, река Стугна; скудную струю имея, поглотив чужие ручьи и потоки, расширяясь к устью, юноше князю Ростиславу затворила Днепр у темного берега. Плачет мать Ростиславова по юноше князе Ростиславе: «Приуныли цветы от жалости и дерево с печали к земле приклонилось».

А не сороки застрекотали: по следу Игореву едет Гза с Кончаком. Тогда вороны не каркали, галки замолкли, сороки не стрекотали, по ветвям ползали только. Дятлы стуком путь к реке указывают, соловьи веселыми песнями рассвет возвещают. Говорит Гза Кончаку: «Коли сокол к гнезду летит, соколенка мы расстреляем своими золочеными стрелами». Говорил Кончак Гзе: «Коли сокол к гнезду летит, соколенка мы опутаем красною девицею». И говорил Гза Кончаку: «Если его мы опутаем красной девицей, ни у нас не будет соколенка, ни у нас красной девицы; и почнут нас птицы бить в поле Половецком».

Говорил Боян о походах Святославовых, песнотворец старого времени, Ярославова, Олегова, княжего: «Хоть и тяжко тебе, голове, без плеч, худо тебе, телу, без головы», Русской земле без Игоря. Солнце светится в небе, Игорь князь в Русской земле. Девицы поют на Дунае. Вьются голоса через море до Киева. Игорь едет по Боричеву к святой богородице Пирогощей. Страны рады, города веселы. Спев песню старым князьям, а потом молодым петь: «Слава Игорю Святославичу, буйному туру Всеволоду, Владимиру Игоревичу!» Да здравствуют князья и дружина, ведущие борьбу за христиан с погаными полками! Князьям слава и дружине!

Слова аб палку Ігаравым, Ігара, сына Святаслаўлева, унука Олегава

Пераклаў

Янка Купала

I

Ці не лепей было-б, каб нам, браццця, пачаць старадаўнымі словы тужліву аповесць аб паходзе Ігаравым, Ігара Святаслаўліча?

Дый пачаціся песні той сягачасным ладам, а не складам Баянавым.

Баян бо чарадзейны, калі каму песню хацеў утварыці, то расцякаўся мысляй па дзераву, воўкам шэрым па полі, арлом сізым пад воблакі.

Помнячы бо, скажам, даўных часаў разруху, выпушчаў дзесяць сокалаў на лебедзяў стада, а якую з іх дагоніваў сокал, тая першая песню пяяла старому Яраславу ці харобраму Імсціславу, што зарэзаў Радзедзю перад войскам касожынскім, або краснаму Раману Святаслаўлічу.

Але, браццця, Баян жа не сокалаў дзесяць пускаў на лябяжае стада,—ён свае чарадзіўныя пальцы на струны жывыя ўскладываў, а тыя князям самі славу галосілі.

Дык пачанем жа гэтую, браццця, аповесць ад старага Ўладзіміра да Ігара сягачаснага, што скаваў розум сілай сваёй і навастрыў сваё мужнасцю сэрца; напоўніўся духу барацьбянага і павёў свае войска адважнае на землі Палавецкія за Рускія землі.

II

Тады азірнуўся на светлае сонца Ігар і бачыць пакрытымі цемрай ад сонца ўсіх сваіх вояў. І скажа Ігар тут дружыне сваёй:

«О, браццця й дружына! лепей-жа быці пацятаму, чым быці ў палоне. Пасядзем-жа, браццця, на быстрыя коні свае зірнуці на Дон сінявокі».

На вум князю ўспала жаданне, не гледзячы з неба варожбаў, паспытываць Дона вялікага.

«Хачу бо, кажа, дзіву заламаці аб поля канец Палавецкага; з вамі, русіны, хачу сваю голаў злажыці або напіціся шоламам Дона».

О, Баяне, часінаў старых, салавейча! Апяяў-бы ты гэты паход, імкнучы салоўкай па дрэву выдумнаму, духам сягаючы воблакаў, славай звіваючы гэтага часу абедзве паловы. Траянавы сочачы след, цераз поле на горы! Песню спяяў-бы тады для Ігара, унука таго:

«Не сокалаў бура занесла праз поле шырокае,
Галіцаў стады кацiліся к Дону вялікаму»...

Або апяяці было, чарадзейны Баяне, Велеса ўнуча:

«Коні іржуць за Сулаю,
Слава звініць у Кіеве,
Трубы трубяць у Ноўгарадзе»...

Сцягі стаяць у Пуціўле, жджэ Ігар мілага брата Усевалада.
І скажа яму буй тур Усевалад:

«Адзін брат, адзін свет светлы ты, мой Ігару! Абодва з табой Святаслаўлевы дзеці. Сядлай, браце, быстрыя коні свае, а мае для цябе нагатове ўжо асядланы ўперад ля Курска. А куршчане мае табе ведамы кметы: пад гудамі трубаў радзіліся, пад шоламамі ўзгадаваліся, канцом дзіды ўскормлены; ім шляхі вядомы, ім рыцьвы знаёмы, лукі ў іх нацягнуты, сто стрэл нарыхтована, шаблі навострaны, самі яны імчацца, як шэрыя ваўкі па полі, шукаючы чэсці сабе, а князю славы».

Тады князь Ігар уступіў у залатыя страмёны й паехаў па чыстаму полю. Сонца яму цемнатой заступіла дарогу: ноч, стогнучы грозьбы яму, разбудзіла птушшо, а выццё звярынае ў стады іх збіла; Дзіў кліча паверх лесу, слухаць наказвае зямлі незнаёмай— Волзе, і Памор'ю, і Пасулью, і Суражу, і Карсуню, і табе, тмутараканскі балване!

А полаўцы нецярэбленымі шляхамі к Дону пабеглі вялікаму; толькі калёсы скрыпяць іх апоўначы, маўляў тыя лебедзі спуджаны.

Ігар к Дону войска вядзе.

А ўжо бяда яго пасець птаха па дзераву; ваўкі па ярах нядобрае варожаць; арлы клекатам звяр'ё завуць косці збіраць; лісіцы брэшуць на шчыты бліскучыя.

О, зямля Руская, ты ўжо за рубеж перасягнула!

Доўга ноч танула ў мроку; зараніца досвіт набліжала; імгла поле засланіла; заснуў свергат салавейчы; гоман галічы ўзбудзіўся.

Русіны поле шырокае загарадзілі шчытамі бліскучымі, шукаючы чэсці сабе, а князю славы.

III

З пазаранку ў пятніцу, патаптаўшы паганае войска палавецкае і рассыпаўшыся стрэламі па полі, паімчалі прыгожых дзяўчат палавецкіх, а з імі золата і папоны, і аксаміты дарагія; плашчамі, апоньчамі і кажухамі ды ўсялякімі палавецкімі тканінамі ўзорнымі пачалі масты масціць па балотах і гразкіх мясцах.

Сцяг чырвоны, харугвя белая, чырвоны бунчук, сярэбраная дзіда—Святаслаўлічу Храбраму!

Дрэмле ў полі Олегава гняздо харобрае. Далёка заляцела! Не было яно зроджана ў крыўду ні сокалу, ні крэчату, ні табе, чорны ругане, паганы палаўчаніне!

Гза бяжыць шэрым воўкам, Канчак яму знача след к Дону вялікаму.

На другі дзень вельмі рана крывавыя зоры світ узнімаюць, чорныя хмары з мора ідуць, хочуць прыкрыці два сонцы, а ў хмарах маланкі мігаюцца сінія.

Быці вялікаму грому! Ісці дажджу стрэламі з Дона вялікага! Тут паламаціся дзідам, тут пашчарбаціцца шаблям аб шоламы палавецкія на рэчцы Каяле, ля Дона вялікага.

О, Руская зямля, ты ўжо за рубеж перасягнула!

Вось ветры, Стрыбожыя ўнукі, павеялі стрэламі з мора на храбрае войска Ігарава. Дудніць зямля; рэкі мутна цякуць; порась поле пакрывае; сцягі гамоняць.

Ідуць полаўцы ад Дона і ад мора, і ад усіх старон рускае войска абступілі. Дзеці нячысцікавы клікам поле перагарадзілі, а русіны храбрыя загарадзілі яго шчытамі чырвонымі.

Яр тур Усеваладзе! Стаіш у барацьбе й засыпаеш ты вояў варожых стрэламі, грыміш ты аб шоламы мячамі сталёвымі. Дзе толькі даскочыш, сваім залатым, тур, свецячы шоламам, ляжаць там паганыя галовы палавецкія. Пашчапаны гартоўнымі шаблямі й шоламы аварскія ад цябе, яр тур Усеваладзе!

Якая цана ранам, брацця, таму, хто забыўся пачоту й жыцця, й Чэрнігава горада, забыўся на бацькаўскі стол пасад залаты, на сваю мілую пяшчоту, ясную Глебаўну, на звычай і абычай!

IV

Былі векі Траянавы, прамінуліся леты Яраслаўля. Былі паходы Олегавы, Олега Святаслаўліча: той-бо Олег мечам разруху каваў і стрэлы сеяў па зямлі. Ступае са звонам у стрэмя злачонае ў горадзе Тмутаракані, той звон даўны чуе вялікі Яраслаўлін сын Усевалад, а Уладзімір кожну раніцу затыкаў вушы ў Чэрнігаве. Барыса-ж Вячаслаўліча нядобрая слава на суд прывяла на апошні, і ў зялёным заціньні каяльным божую пасцель паслала за крыўду Олегаву, маладога і храбрага князя. З таей-жа Каял-ракі Яраполк палялеяў між угорскімі інаходамі бацьку свайго да Сафіі святое да Кіева.

Тады пры Олегу Гарыслаўлічу рассяваліся й раслі міжусобіцы. Гібнула жыццё Дажджбожага ўнука; у калатнінах князевых людзі свой век скарачалі.

Тады на Рускай зямлі рэдка пяяў аратай, але вараннё пакрумквала часта, дзелячы труп'ё між сабою, а галіцы гоман заводзілі свой, на ежу ляцеці збіраючыся.

Было гэта ў бітвы і ў тыя паходы, а гэтакіх бітваў і слухам не чулі!

V

Ад рання да вечара, ад вечара да світу лятуць стрэлы гартоўныя, грымяць шаблі аб шоламы, трашчаць дзіды сталёвыя ў полі незнаёмым, сярод зямлі Палавецкае. Чорная зямля пад капытамі касцьмі была пасеяна, а крывёю палітая,—туга абышла па Рускай зямлі.

Што там шуміць? Што там звініць далёка рана перад зарою?

Ігар палкі заварочвае: жаль бо яму міла брата Усевалада.

Біліся дзень, біліся другі, трэцяга дня к палудню рухнулі сцягі Ігаравы. Тут два браты разлучыліся на беразе быстрай Каялы. Тут віна крывавага не хапіла, тут баль дакончылі храбрыя русіны: сватоў напаілі, а самі палеглі за Рускую зямлю.

Нікне трава ад жаласці, а дзерава пад тугою к зямлі прыхілілася.

VI

Ужо вось, браццял, невясёлая гадзіна наступіла, ужо пустыня сілу прыкрыла.

Крыўда паўстала ў сілах Дажджбожага ўнука, дзевай узышла на зямлю Траянаву, успляснула крыллем лябяжым на сінім моры, а, плюскаючы ў Доне, спудзіла часіны шчаслівыя.

Князевы міжусобіцы—згуба для нас ад паганых. Казаць стаў брат брату: «гэта маё і тое-ж маё!» І пачалі князі аб малым «гэта вялікае» казаці і самі на сябе загубства каваці. А паганцы з усіх старон набягалі з перамогай на Рускую зямлю.

О! далёка сокал заляцеў, птушак збіваючы,—к мору!

А Ігараву храбраму войску не ўваскроснуці. Па ім загаласіла Карына, і Жэля панеслася па Рускай зямлі, наводзячы смагу людзям у полымі рогу. Заплакалі жоны рускія, галосячы:

«Ужо нам сваіх мужоў мілых ні мысляй памысліць. ні думай

падумаць, ні вочмі сваймі азіраці, а золата й срэбра таго й пагатове не бачыць ніколі!»

І застагнаў-жа, браццця, Кіеў тугою, а Чэрнігаў напасцямі! Нуда разлілася на Рускай зямлі; няўцешная жальба пацякла сярод Рускай зямлі. А князі сабе самі праступства кавалі; а паганыя самі адны, з перамогамі наваліўшыся на Рускую зямлю, дань вымагалі па белцы з двара.

Тыя бо два храбрыя Святаслаўлічы, Ігар і Усевалад, ужо няпраўду збудзілі, якую тут прыспаў быў іх бацька, Святаслаў грозны, вялікі кіеўскі. Быў ён гразою: верх браў сваім войскам магутным і мячамі сталёвымі. Наступіўшы на зямлю Палавецкую, патаптаў узгоры і долы; замуціў і азёры і рэкі; засушыў балоты й крыніцы. А паганага Кабяка з узлучыны морскай, ад жалезных вялікіх палкоў палавецкіх, як віхрышча выхапіў. І зваліўся Кабяк у горадзе Кіеве, у замку Святаслаўлевым.

Тут немцы і венедыйцы, тут грэкі і маравы пяюць славу Святаслаўлю, выдумляюць на князя Ігара, што патапіў багацце на донні Каялы, ракі палавецкай, насыпаўшы рускага золата там. Там Ігар князь ссядаў з залатога сядла і садзіўся ў сядло нявольніка.

Занылі сцены гарадоў, завяла вясёласць.

VII

А Святаслаў сумны сон сніў у Кіеве на горах у гэтую ноч.

«З вечара адзявалі мяне, кажа, у чорную пасцілку на цясовай краваці; чэрпалі мне сіняе віно, змешанае з зеллем; сыпалі мне з пустых калчанаў паганых полаўцаў буйныя пэрлы на грудзі, ды песцяць мяне. Ужо дошкі без скрэпаў на маіх залатаверхіх харомах. Усю ноч з вечара дзікае груганнё гракала; пабыло каля Плеснеску на балоні, каля нетраў Кісані, і к сіняму мору няслося».

І сказалі баяры князю:

«Ужо, княжа, туга розум твой замуціла: гэта вось два сокалы зляцелі з бацькавага залатога пасада, каб горад Тмутаракань пашу-

каці або напіціся шоламам Дона. І ўжо сокалам крыллі падсечаны шаблямі погані, а саміх іх павуцінай жалезнай апуталі. Цёмна было ўжо на трэці дзень: два сонцы патухлі, абодва чырвоныя згаслі слупы, а з імі і месяцы два маладыя. Олег і Святаслаў завалакліся цямрыцай і ў моры яны патанулі, і гордасці хану дадалі вялікай. На рэчцы на Каяле святло цьма пакрыла; па Рускай зямлі, як рысяў племя, распасцерліся полаўцы. Ужо ўзнялася над хвалай пахула, ужо ўзсела насілле над воляй і ўжо ўрэзаўся Дзіў на зямлю. Вось бо гоцкія красныя дзевы запелі на беразе сіняга мора, золатам звонячы рускім: пяюць яны Бусавы часы, і помсту лялеюць Шараканаву... А мы ўжо, дружына твая, не знаем вясёласці».

Тады вялікі Святаслаў абазваўся слаўцом залатым, са слязамі змешаным, і сказаў:

— «О, мае сыноўцы, Ігару і Усеваладзе! Рана пачалі вы зямлю Палавецкую рэзаць мячамі, а славы шукаці сабе. Але не з чэсцяю ўходалі, бо не з чэсцяй паганскую кроў пралілі. Вашы адважныя сэрцы ў сталі нязломнай закованы і згартованы адвагай. Дый што вы стварылі маёй сярэбранай сівізне! Не даждаліся вы сільнага й багатага брата майго Яраслава з яго многавоямі, з чарнігаўскімі ваякамі—з магутамі і з татранамі, і з шальбірамі, і з тапчакамі, і з рэвугамі, і з ольберамі. Яны-ж, бывала, без шчытоў, з захаляўнымі нажамі, клікам палкі пабяджаюць, звонячы прадзедняй славай. Але вы сказалі:

«Храбрымося самі! Самі пярэднюю славу захопім і з задняю самі падзелімся».

«А ці-ж дзіва тут, браццяя, і старому памаладзеці? Калі сокал у годах, высока ўзбівае ён птушак, свайго не папусціць у крыўды гнязда! Але ў тым гора, што князі ўжо мне ў непадмогу. У ніштто абярнуліся тыя часіны! Вось у Рымаве крычаць пад шаблямі палавецкімі, а Уладзімір пад ранамі. Туга і нудота Глебаву сыну!»

VIII

Княжа вялікі, Усеваладзе! Ці не мысляй табе-б прыляцеці, каб бацькаў пасад убярэгчы! Ты бо можаш распырскаці вёсламі Волгу,

за шоламам вычарпаць Дон. Каб ты быў, то была-бы па нагаце[1] нявольніца, а па рэзане[2] нявольнік. Ты бо можаш насуха жывымі страляць самастрэламі, удалымі Глеба сынамі.

Ты буй Рурыча й Давідзе! Ці-ж не вашыя гэта ў крыві пазлачоныя шоламы плавалі? Ці-ж не ваша дружына адважная рыкае, як туры, гартоўнымі ранена шаблямі ў полі незнаёмым? Уступіце, сябры, у залатыя страмёны за крыўду гэтага часу, за Рускую зямлю, за раны Ігаравы, смелага Святаслаўліча!

Галіцкі Осмомысле Яраслаўле! Высока сядзіш ты на пасадзе сваім златакованым; падпёр угорскія горы сваімі палкамі жалезнымі, шлях заступіў каралю, зачыніў Дунаю вароты, шыбаючы бярэмі цераз воблакі, да Дуная суды судзячы. Грозьбы твае па землях цякуць; адчыняеш Кіеву вароты; страляеш з бацькавага пасада залатога султанаў па-за землямі. Страляй, княжа, Канчака, паганага раба, за Рускую зямлю, за раны Ігаравы, адважнага Святаслаўліча!

А ты, буй Рамане і Мсціслаўле! Храбрая мысль носіць розум ваш на дзела. Высока плывіцё на дзела, з адвагай, як сокал на ветрах лунаючы, хочачы сходаці птаха ў бітве. Ёсць бо ў вас жалезныя наперснікі пад шоламамі лацінскімі. Ад іх затрасліся ўжо землі і шмат якіх краеў: Хінова, Літва, Дарамела, яцвягі і полаўцы, кінуўшы дзіды свае й галовы свае нахіліўшы пад тыя стальныя мячы.

Але ўжо, княжа Ігару, аслабела сонца святло, а дзерава лісць не на добрае скінула! Па Росі і Суле гарады падзялілі, а Ігарава храбрага войска не ўваскрасіці. Дон цябе, княжа, кліча і іншых князёў заве на пабеду.

Ольговічы, храбрыя князі, утаміліся ў барацьбе. Інгвар і Усевалад і ўсе тры Імсціслаўлічы—не благога гнязда птахі шасцікрылыя! Не жэрабем пабедным сабе ўладу прыдбалі! Што-ж вашы шоламы залатыя і ляцкія шчыты? Загарадзіце полю вароты сваймі

[1] і [2] Нагат і рэзан—тагачасныя грошы.

вострымі стрэламі за зямлю Рускую, за раны Ігаравы, буйнага Святаслаўліча!

IX

Ужо бо Сула не цячэ ручаямі срабрыстымі к гораду Пераяслаўлю, ужо Дзвіна балотам цячэ к тым грозным палачанам, пад воклік паганых. Адзін толькі Ізяслаў, сын Васількавы, пазваніў сваймі вострымі мячамі аб шоламы літоўскія. Перабіў славу дзеду свайму Усяславу, а сам пад чырвонымі шчытамі на крывавай траве, пабіты літоўскімі мячамі, з Хоціем лёг, а той кажа:

«Дружыну тваю, княжа, птахі крыллем апранулі, а звяры кроў палізалі!»

Не было тут брата, Брачыслава, ні другога Усевалада; адзін ён выпусціў жамчужную душу з храбрага цела цераз залатое ажарэлле.

Занылі песні, зачахла вясёласць, трубяць трубы гарадзенскія.

Яраслаўле і ўсе ўнукі Усеслаўлевы! Апусціце ўжо сцягі свае! Пахавайце мячы свае пашчарбаныя! Вы бо сваімі нязгодамі пачалі наводзіць паганых на Рускую зямлю, на надзел Усяслава, ад чаго і насілле пайшло ад зямлі Палавецкай.

У сёмы Траянавы век жэрабя кінуў Усяслаў аб дзяўчыне мілай сабе. Падпёршыся клюкамі, ён на кані паімчаўся да горада Кіева і даткнуўся дзідай да кіеўскага залатога пасада. Ад іх скочыў зверам дзікім. Апоўначы з Белгарада ахутаўся сіняй імглой, а на раніцу, узняўшыся, браму стракалам адчыніў Ноўгараду, разбіў Яраслаўлеву славу і скочыў ваўком да Нямігі з Дудутак.

На Нямізе снапы сцелюць галовамі, малоцяць цапамі сталёвымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром былі засеяны, засеяны былі касцямі сыноў рускіх.

Усяслаў князь людзям суд судзіў, гарадамі князёў надзяляў, а сам поначы воўкам гуляў. З Кіева да пятухоў дасцігаў Тмутаракані; вялікаму Хорсу ваўком шлях перабягаў. Таму ў Полацку рана званы пазванілі к завутрані ў Сафіі Святой, а ён у Кіеве звон чуе

Хоць і вешчая душа ў дзёрзкім целе была, але часта бяды нацярпеўся. Яму першаму вешчы Баян і прыпеўку злажыў дасціпную:

«Ні хітраму, ні быстраму,
Ні шпаркаму птаху
Не мінуці божага суда».

О! стагнаці Рускай зямлі, успомніўшы быўшу часіну і быўшых князёў!

Старога таго Уладзімера не магчыма было прыкаваці да кіеўскіх гораў! Цяпер бо яго сцягі сталі—адны Рурыкавы, а другія—Давідавы, але хобаты іх паасобку калышуцца.

X

Пяюць дзіды на Дунаі. Яраслаўны голас чуецца. Беспрыпынную зязюляй раным-рана галосіць:

«Паляту, кажа так, па Дунаю зязюляй, абмачу рукаво бабровае ў Каяле рацэ, абатру князю раны яго на магутным на целе яго».

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі на сцяне, наракаючы:

«О, вецер, вятрыска! Чаму ты насільна так вееш? Чаму імчыш ханскія стрэлы на лёганькім крыллі сваім ды на вояў мужа майго? Ці-ж веяць мала табе ўгары пад аблокі, лялеючы ў моры сінім караблі? Чаму ты вясёласць маю па кавылі развеяў?»

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі горадзе на сцяне, наракаючы:

«О, Днепру Славуцічу! Горы каменныя ты перасек скрозь зямлі Палавецкае; чоўны лялеяў ты на сабе Святаслаўлевы к войску Кабякаву. Прылялей-жа й мужа майго да мяне, каб рана я слёз не ссылала на мора к яму!»

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі на сцяне, наракаючы:

«О, светлае сонца, прасветлае! Усім ты нясеш і цяпло і красу. Нашто-ж нанясло ты свой промень гарачы на вояў тых мужа майго? Па полі бязводным ім смагаю лукі звяло, а ўтулы тугой ім заткала!»

XI

Прыснула мора з поўначы, смерчы імглами ідуць. Князю Ігару бог знача дарогу з зямлі Палавецкай на Рускую зямлю, дзе бацькаў пасад яго жджэ.

Патухла вячэрняя зорка.

Ігар спіць, Ігар вока не зводзіць, Ігар думкаю мерае поле ад Дона вялікага к малому Данцу.

Апоўначы свіснуў Аўлур за ракою каню, разумецц загадвае князю.

А князя Ігара няма!

Клікнуў—дрыгнула зямля, зашумела трава, палавецкія вежы ўспужаліся.

А князь Ігар к трыснягу гарнастаем панёсся і гогалем белым паймчаўся к вадзе. На быстрага рынуў каня, саскочыў з яго босым воўкам, к логу Данца пакаціўся й паляцеў сокалам пад імгламі, забіваючы гусі і лебедзі к снеданню, полудню й вячэры.

Як Ігар паляцеў сокалам, тады воўкам Аўлур пакаціўся, абіваючы росы сабою сцюдзёныя: падарвалі бо коней сваіх быстраногіх.

І кажа рака Данец:

«Княжа Ігару! Не мала велічча табе, Канчаку дакукі, а радасці Рускай зямлі!»

А князь Ігар кажа:

«О, Доньча! Не мала велічча табе, што лялеяў ты князя на хвалях і зялёную траву яму падсцілаў на сваіх берагах срэбраных, адзяваючы цёплымі ймглами яго пад ценем зялёнага дзерава, і спярог на вадзе яго гогалем, чайкамі на ручаях, чарнедзямі на ветрах. Не такая, кажа, рака Стугна. Маючы вузкі прачёк, праглынуўшы чужыя ручаі й распасцёршы хвалі к утоку, князю Расціславу маладому берагам цёмным Дняпро зачыніла. Плачацца маці Расціслаўля па сваім маладым князю Расціслаўлю. Кветкі жальбою занылі, а дрэва з тугою к зямлі нахілілася».

Не сарокі так застракаталі: гэта едзе Ігаравым следам Гза з Канчаком. І тады груганы не закрумкалі, галкі замоўклі, сарокі не стракаталі, па лозах паўзлі толькі. А дзятлы тукатам к рэчцы шлях паказваюць, салавейкі вясёлымі песнямі раніцу згадваюць.

І гаворыць Гза Канчаку:

«Калі сокал ляціць да гнязда, мы застрэлім саколіча стрэламі сваймі залатымі!»

А Канчак Гзе адказвае:

«Калі сокал ляціць да гнязда, мы сакольца апутаем краснаю дзевай!»

А Гза кажа Канчаку:

«Калі мы яго дзеваю краснай апутаем, мець не будзема мы ні саколіча, ані краснае дзевы, ды пачнуць нас тады біці птахі ў полі Палавецкім!»

XII

І сказаў Баян аб днях Святаслаўлевых, Баян-песнятворац далёкага часу, Яраслаўлева, Олегава:

«Княжа! Хоць і цяжка табе, галаве, без плячэй, але трудна табе, целу, без галавы!»

Так і Рускай зямлі без Ігара. Сонца свеціцца на небе, Ігар князь—на Рускай зямлі. Пяюць дзевы на Дунаі, галасы плывуць праз мора і да Кіева. Ігар едзе па Барычэву да святое багародзіцы Пірагошчай. Рады староны, весялы гарады.

Спяяўшы песню старым князям, а пасля маладым пяяці:

«Слава Ігару Святаслаўлічу, буй туру Усеваладу, Уладзіміру Ігаравічу! Здароўя князям і дружыне, выступаючым за хрысціян на войска паганых! Слава князям і дружыне!» Амінь.

Менск, 30/X 1919 г.

Слова аб палку Ігаравым



Вершаваны пераклад
з арыгінала

Пераклаў
Янка Купала

I

Ці не добра было-бы нам, брацці,
Старадаўнымі словы пачаці

Сказ аб Ігара трудным паходзе,
Святаславіча князя прыгодзе?

А пачацца сягачасным ладам
Песні той,—не Баянавым складам!

Бо Баян чарадзейны, як песняй,
Захацеў каму пеці пачэсне,

Расцякаўся ён мысляй па дрэву,
Шэрым воўкам па полі пасеву,

Сізакрылым арлом пад аблокі,—
Так захопліваў свет ён далёкі!

Помніў ён бо, як кажуць, старыны
І разрухі ўсе даўных часінаў.

Выпушчаў дзесяць сокалаў радам
Ды на белае лебедзяў стада,

А якая з іх сокалу ўпала,
Тая першая песню пяла

Ці старому тады Яраславу,
Ці харобраму князю Мсціславу,

Што ў борцы зарэзаў, як згледзеў,
Перад войскам касожскім Радзедзю,

Або краснаму пела Раману
Святаславічу ў хвалу й пашану.

Але, брацці, не сокалаў дзесяць
Выпушчаў у свет Баян з пералесіц,

Не лябяжае стада, бы ў байцы,—
А ён клаў свае вешчыя пальцы

На пявучыя струны, а тыя
Пелі славу князям, як жывыя.

Дык пачнем-жа мы, брацці, сказ гэты
Ад старога Ўладзіміра летаў

Да сучаснага Ігара воя,
Што скуў розум свой сілаю ўдвое.

Навастрыў сваё сэрца адвагай,
Барацьбянай напоўніў дух смагай

І павёў цераз сёлы і вёскі
Свае дужыя, храбрыя войскі

На зямлю палаўчан, на змаганне
Ды за Рускай зямлі бытаванне!

II

Як зірнуў тады Ігар на сонца,
Бачыць—цемра зацмення бясконца

Яго войска пакрыла, як сажай.
Тут дружыне сваёй ён і кажа:

«Ой вы, браццi мае і дружына!
Лепей будзе, каб кожны з нас згінуў

«Чымся быць усім нам у палоне.
Сядзьма-ж, браццi, на быстрыя коні

«Ды на Дон сінявокі паглянем!»
На вум князю залегла жаданне:

Не зважаючы з неба варожбаў,
Сягнуць Дона вялікага ложбаў.

«Вось хачу, кажа, вострую дзіду
Заламаць за бяду і абіду

«Аб канец Палавецкага поля;
Хачу з вамі, русіны, за волю

«Палажыць сваю голаў да скону,
Ці напіціся шоламам Дону».

О, Баяне, часінаў мінулых
Салавейка! На струнах-бы чулых

Ты апеў-бы паход слаўны гэны,
Імкнучы, салавейча нязменны,

Па выдумнаму дрэву далёка,
Дасягаючы духам аблокаў,

Часаў даўных звіваючы й новых
Сваёй славай абедзве паловы,

След Траянавы сочачы, скоры,
Цераз поле, даліны, на горы!

Ты-бы песню тады аб набегах
Спеў для Ігара, ўнука Олега:

«Ой, не сокалаў несла віхура
Цераз поле шырокае—бура!

«А кацiлiся галiцы стадам
Да вялiкага Дона з нападам»...

Цi запець было, вешчы Баяне,
Ўнуча Велеса, гэта пяянне:

«Конi рзуць за Сулою-ракою,
Слава ў Кiеве звонiць з зарою!»

Чутны трубы з Навагрода,
Стаяць сцягi у Пуцiўлi;
Iгар брата Ўсевалода
Жджэ прыход у кожнай хвiлi.

I прышоў брат i казацi
Стане буй тур Усяволад:
«Ты ў мяне адзiн, мой браце,
Свет мой светлы, Iгар-волат!

«Мы з табой абодва сённі
Святаслававыя дзеці,
Дык сядлай свае, брат, коні,
Коні быстрыя, бы ўспеці.

«А мае напагатове
Ўжо, як знаеш, асядланы
Яшчэ ўперад у дуброве,
Каля Курска, раным-рана.

«А мае-ж куршчане любы
Табе ведамыя кметы:
Пад гудамі гулкіх трубаў
Спарадзіліся ў дасветы.

«Гадавалі іх шаломы,
А канцом дзіды ўскармлёны,
Шляхі ім усе вядомы
І знаёмы яры, склоны.

«Ў іх нацягнутыя лукі,
Нарыхтаваныя стрэлы;
Шаблі вострыя ў рукі
Пахапалі, дзержаць смела.

«Як ваўкі сівыя ў полю,
Самі мчацца ў бой крывавы,
Каб здабыць сабе чэсць, волю,
Каб прыдбаці князю славы!»

Князь Ігар тады ў залатое сядло
Сеў і паехаў па чыстым разлогу,
А сонца на небе, згасіўшы святло,
Цемрай яму заступіла дарогу.

Ноч, стогнучы жуткія грозьбы яму,
У полі маркотным птушшо разбудзіла.
А выцце звярынае ў гэтую цьму
У стада пужлівае птахаў тых збіла.

Паверх лесу кліча ўжо чарамі Дзіў,
Слухаці кажа зямлі незнаёмай—
Корсунь, Памор'е і Сураж зацміў,
Волзе, Пасуллю папутаў заломы.

Кажа й табе яго слухаць, балване,
Што разбаярыўся ў Тмутаракане!

А полаўцы шляхам пабеглі нябітым
К вялікаму Дону, як зверы, жудосна;
Калёсы у поўнач крычаць іх адны там,
Маўляў тыя лебедзі спуджаны со-сну.

Вось Ігар-князь к Дону вядзе сваіх вояў,
А птахаў яго бяда сочыць па суччы;
Ваўкі па бярлогах варожаць благое,
І брэшуць лісіцы на шчыты бліскучы.

Арлы заклікаюць звяр'ё клекатаннем
Збіраць на пабоішчы косці людскія...
О, Рускае племя! Далёкім сяганнем
Ты ўжо перайшло рубяжы палаўцкія.

Доўга ў мроку ноч танула,
Зараніца світ зьбліжала,
Поле мглою зацягнула,
Ранне жніва сваё жала.

Сціхнуў свергат салаўіны,
Узбудзіўся гоман галчы...

О, харобрыя русіны!
Прад навалаю паганчай

Загародзілі шчытамі
Вялікае тое поле,
Здабываючы чэсць самі,
А для князя славы болей!

III

А во ў пятніцу рана стапталі
Палавецкае войска паганае;
Ў полі стрэламі там засвісталі,
Загулялі пабеду праслаўную.

Ўзялі красных дзяўчат палавецкіх
І папоны, аксаміты, золата—
Ўсё, што ўпала да рук удалецкіх,
Што бітвой не было ў попел змолата.

Палавецкім багаццем—плашчамі,
Кажухамі, тканінай залотнаю
Памасцілі масты пад нагамі,
Загацілі праходы балотныя.

Сцяг чырвоны, дзіда серабрана
І бунчук па абычаю добраму
Ў нагароду за славу, за раны,
Святаславічу, князю харобраму!

Дрэмле Олега харобрае
Ў полі на шчытах гняздо.
Ой, заляцела, адважнае,
Дужа далёка яно!

А не было-ж яно зроджана
Ў крыўду нікому нідзе—
Ні быстракрыламу крэчату,
Ні сакалу, ні бядзе

І ні табе, палаўчаніне,
Чорны паганы груган.
Крыўдзе тваёй не спакорыцца
Вольны Олегавы стан.

Гза бяжыць шэрым воўкам
Там па полі па дзікаму,
А Канчак яму сцежку
Значыць к Дону вялікаму.

На другі дзень вельмі рана
Над зямлёй крывавы зоры
Світ усходні абвяшчаюць,
Хмары чорныя йдуць з мора.

Сонцы два прыкрыцці хочуць,
Як дзве ясныя заранкі,
А во ў хмарах гэных чорных
Ззяюць сінія маланкі.

Быці вялікаму грому
Над каласамі паспелымі;
Дожджу ісці каляному
З Дона вялікага стрэламі.

Тут паламаціся дзідам
Па-над Каял-ракі доламі,
Тут пашчарбаціцца шаблям
Аб палавецкія шоламы.

О, зямля Руская! З славай
Воі твае маладзецкія
Перасягнулі далёка
Ўжо рубяжы палавецкія.

Вось ветры, Стрыбожыя ўнукі,
Павеялі стрэламі з мора
На храбрае Ігара войска,
Узгадована ў долі і ў горы.

Зямля і дудніць і трасецца,
Цякуць памутнеўшыя рэкі;
Туман пакрывае ўсё поле,
А сцягі гамоняць: на векі!

Ідуць полаўцы ад Дона
І ад мора ўсплылі,
Войска рускае навокал
Нетрай абступілі.

Перагарадзілі поле
Шатанята клікам,
А харобрыя русіны—
Шчытамі і пікай.

Ой ты, яр тур Усяволад!
Стаў у бої забіякай:
Засыпаеш ты варожых
Стрэламі ваякаў.

І грыміш аб іх шаломы
Стальнымі мячамі;
Дзе ўпадзеш, тур, залатымі
Свецячы шчытамі,

Там кладуцца ў рад галовы
Полаўцаў паганых,
І аварскія шаломы
Шабляй пашчапаны.

Якая цана ранам, браццi, таму,
Хто забыўся жыцця яснаты,
На горад Чэрнігаў хто ў боях забыў
І на бацькаў пасад залаты?

На мілую любу, Глябоўну сваю,
Яснавокую краску-жану,
На звычай, абычай прадзедаў стары,—
Хто ўсё гэта забыў у вайну?

IV

Былі слаўныя, дзеяў Траяна, вякі,
Прамінулі гады Яраслава,
І паходы Олега былі працяклі—
Ўсё Олега з сыноў Святаслава.

Той Олег бо мячамі рузруху каваў,
Па зямлі сеяў стрэлы разгонам,
Калі ў горадзе Тмутаракані ступаў
Ў залатое страмя ён са звонам.

Чуў здалёку той даўны трывожлівы звон
Яраслававы сын, Усяволад.
А Ўладзімір штораніня, пакінуўшы сон,
Зачыняўся ў Чэрнігава-горад.

А Барыса таго Вячаславіча,
Маладога і храбрага князя,
На апошні суд слава паклікала,
За якою ганяўся ў адвазе,

Ї на векі пасцелю зялёную
У каяльным заценні паслала—
Ўсё за крыўды, абіды Олегавы,
Што загубства разводзіў нядбала.

К той Каялы ракі між угорскімі
Їнаходцамі сам палялеяў
Яраполк свайго бацьку да Кіева,
Да сялібы святое Сафеі.

Пры Олегу тады Гарыславічу
Моц было міжусобіц, няладаў;
Жыццё гінула ўнука Дажджбожага,
Люд свой век скарачаў ў княжых звадах.

На зямлі тады Рускай узбуранай
Рэдка пеў аратай за сахою,
Груганнё зато часта пагрумквала,
Ў полі дзелячы труп між сабою.

А на ежу ляцеці збіраючысь,
Галкі гоман заводзілі й гулі.
Так было ў тыя войны й пабоішчы,
А такіх бітваў слухам не чулі!

V

Ад раніцы да вечара,
Ад вечара да раніцы
Лятуць стрэлы гартоўныя,
Грымяць мячы аб шоламы,

Трашчаць дзіды сталёвыя,
Шумяць харугві стужкамі

Сярод палёў няведамых,
Сярод зямель палоўцавых.

Зямля тая ўчарнелая,
Пабітая капытамі,
Касцямі ўся пасеяна,
Крывёю ўся палітая.

Вялікай абхапілася
Зямля тугою Руская.

Што там шуміць, што там звініць
Рана йшчэ перад зарою?—
Ігар палкі ўводзіць свае:
Жаль яму Ўсеўлада брата.

Біліся дзень, дзень і другі,
Трэцяга дня пад палудня
Сіла змагла, сіла лягла,
Рухнулі Ігара сцягі.

Тут два браты разлучыліся
На беразе быстрай Каялы,
Тут не хапіла крывавага
Віна ды ў гульні небывалай.

Тут пір дакончылі храбрыя
Русіны—не дарма набеглі,—
Сватоў спаілі, а самі там
За Рускую зямлю палеглі.

Ў полі далёкім ад жаласці
Маркотна ные травіца,
А пад тугой цяжкай дзерава
К зямлі сірацінай хіліцца.

VI

Во, невясёлая, брацці, гадзіна настала!
Сілу пустыня прыкрыла ўжо грознай навалай:

Крыўда паўстала у ўнука Дажджбожага сілах,
Дзевай яна на Траянаву землю ўступіла.

Крыллем лябяжым па моры ўсплясНула, а ў Доне
Плюскатам спудзіла шчасныя часы ў бяздонні.

Князевы споркі—людзям ад паганых загуба;
Стаў гаварыцці брат да брата са злосці, нялюба:

«Гэта і гэна маё!» Ды пачалі казаці
Князі аб малым: «Во гэта вялікае, браце!»

А на сябе самі згубства каваці няўстанне...
Скрозь-жа на Русь набягалі з пабедай пагане.

О, як далёка сакол заляцеў ў гэну пору,
Птушак пужлівых збіваючы,—к сіняму мору!

А ўжо адважнага Ігара войска не ўскрэсіць!
Па ім Карына заклікала, гледзя на месяц.

Жэля па Рускай зямлі панясласе з трывогай,
Смагу наводзячы людзям у полымя рогу.

Жоны заплакалі рускія ў жальбах нябылых:
«Ужо нам ні мысляй памысліць мужоў сваіх мілых,

«А ні прадумаці думай, ні вочмі сваімі
Іх азіраць на пуховай пасцелі жывымі.

«Срэбрам і золатам тым пагатове ніколі
Нам не пацешыцца ў долі, самотнае долі!»

І застагнаў-жа, о, брацці, грод Кіеў тугою,
А той багаты Чэрнігаў—напасцю благою!

Журба па Рускай зямлі разлілася разводдзем,
Ды пацякла ненасытная жальба ў народзе.

А на сябе самі князі загубства кавалі,
А тут паганыя самі адны не чакалі,

Панаваліўшысь на Рускую землю з пабедай,
Дань вымагалі па белцы з двара даўным следам.

Тыя бо два Святаславічы, храбрыя воі—
Ігар, Ўсяволад, няпраўду збудзілі сабою,

Што быў прыспаў іхні бацька, той грозны вялікі
Кіеўскі князь, Святаслаў. Ён-жа не для прылікі

Грозьбаю быў над варожымі сіламі злымі
З войскам харобрым сваім і мячамі стальнымі.

На Палавецкія землі нагой наступіўшы,
Узгоры і яры пакуль не стаптаў, стуль не вышаў.

І замуціў там азёры і рэкі ў чаротах,
І засушыў там крыніцы і дрыгвы-балоты,

А паганага Кабяка з узлучыны морскай,
Як бураломнае віхрышча, выхапіў дзёрзка.

Ад тых палкоў палавецкіх, жалезных, агромных,
Ажно зваліўся Кабяк ў Святаслава харомах!

Тут венедыйцы і немцы, тут грэкі й маравы
Славу вялікую дружна пяюць Святаславу.

Ігара каюць, нашто патапіў ён багацце—
Ў донні Каялы-ракі палавецкай загаціў,—

Золата рускага ўсыпаўшы там вельмі многа.
Там-жа князь Ігар ссаджаўся з сядла залатога

Ды на сядло ўжо нявольніка ціха садзіўся.
Ў гарадах сцены занылі, шум-гоман спыніўся.

VII

А на горах у Кіеве гэтае ночы
Святаславу прысніўся сон смутны, прарочы:

«Адзявалі мяне, кажа, з вечара зморна
На цясовай краваці пасцілкаю чорнай;

Віно сіняе чэрпалі мне, бы ў вяселлі,
А ў віне тым благое намешана зелле.

«А з пустых палавецкіх каўчанавых жэрлаў
Мне на грудзі там сыпалі буйныя пэрлы,

«Ды так песцяць мяне. А ўжо дошкі ў праломах
І без скрэп на маіх златаверхіх харомах.

«Усю з вечара ноч груганнё грумкацела,
На балонь каля Плеснеска ўжо даляцела,

«Пабыло на балоцістых нетрах Кісані
І да сіняга мора няслося на ранні!»

І казалі на гэты сон князю баяры:
«Ўжо туга, княжа, розум адзела твой хмарай!

«Гэта ȝ баџькава там ȝалатога пасаду
Сакалы два ȝляџелі, сачыџі прынаду—

«Горад Тмутаракань пашукаџі ȝ раȝгону,
Або ўдоваль напіџіся шоламам Дону.

«І ўжо сокалам гэным шаблямі паганых
Пападсечана крылле на дȝікіх палянах,

«А саміх у жалеȝныя спуталі путы.
Ў трэџі дзень патануў свет у џемрадȝі лютай:

«Сонџы два паџямнелі, слупы агнявыя
Ȝгаслі два, ȝ імі месяџы два маладыя.

«Святаслаў і Олег апрануліся џьмою,
І на моры яны патанулі абое,

«І вялікай буянасџі хану дадалі.
Цьма пакрыла святло на раџэ на Каяле,

«А па Рускай ȝямлі, як гняздо тое рысяў,
Чарадою скроȝь полаўџы параспаўȝліся.

«Ўжо ўȝнялася над хвалай благая пахула,
Ўжо насілле над воляй узнесла—сагнула,

«І ўжо рынуўся Дзіў на ȝямлю на прыселлі.
Вось бо гоџкія красныя дȝевы ȝапелі

«На пахілістым бераȝе сіняга мора,
Рускім звонячы ȝолатам, сочачы ȝоры.

«Ўсё пяюџь яны Бусавы часы і справы
Й Шараканавай помсты лялеюџь праявы.

«А ўжо мы во, твая маладая дружына,
Больш не ȝнаем ȝ табою вясёлых часінаў».

Тады вялікі Святаслаў
Адваўся словам залатым,
Змяшаным з горкімі слязмі,
Ї так сказаў баярам тым:

«О, сыны мае, Їгар і Ўсевалад!
Рана пачалі крышыці
Мячамі зямлю Палавецкую,
А сабе славу сачыці.

«Але толькі не з чэсцяй уходалі,
Бо вы не ў чэсці і хвале
На тым полі далёкім паганскую
Кроў на зямлю вылівалі.

«Вашы сэрцы ў сталь крэпка закованы—
Ўзброены гартам адвагі,
Але што-ж натварылі сівізне вы
Тамка маёй без развагі?

«Не даждалі багатага й сільнага
Брата майго Яраслава
На падмогу з яго многавоямі,
З войскам чарнігаўскім бравым.

«А ваякі яны ўсе сусветныя:
Там і магуты, й шальберы,
Ї татраны ўпобач з равугамі;
Там тапчакі і альберы.

«А яны бо з нажмі захаляўнымі
Ї без шчытоў б'юцца жвава—
Пабяджаюць палкі толькі клікамі,
Звонячы прадзеднай славай.

«Але вы там сказалі: мужаймася
Самі з сваімі мячамі!
Славу самі захопім пярэднюю
Й з задняй падзелімся самі.

«А ці-ж дзіва тут, брацці, вялікае
Памаладзецці й старому!
Калі сокал у гадах—ён высака
Птушку ўзбівае ад дому;

«Не папусце гнязда свайго роднага
Ў крыўду, як бача трывогу.
Але гора ўсё ў тым, што во буйныя
Князі ўжо мне ў непадмогу:

«Тыя часы ў нішто абярнуліся.
Вось бо ля Рымава зрана
Пад шаблямі крычаць палавецкімі,
А Ўладзімер—у ранах!

«І туга і нуда сыну Глебаву,
А ўсё з таго, што крышыцці
Не ў час шлі зямлю Палавецкую,
А сабе славу сачыцці!..»

VIII

О, княжа вялікі, Ўсяволадзе!
Ці не думкай табе-б прыляцелі
Здалёку, каб трон-пасад бацькавы
Залаты ўберагчы ў ліхалецці?

Распырскаць бо можаш ты вёсламі
Многаводную Волгу на бокі

І можаш сваімі шаломамі
Да дна вычарпаць Дон сінявокі.

Каб быў ты, была-бы нявольніца
Па адным, а не болей, нагаце,
А з ёй і нявольніка кожнага
Па разане маглі-бы купляці.

Ты можаш бо з воддалі, насуха,
Над шырокімі бітваў палямі
Жывымі страляць самастрэламі,
Тымі ўдалымі Глеба сынамі.

Ты Давід і буй Рурык! Не вашыя-ж гэта
Пазалочаны шоламы гэнага лета

У крыві, бы ў рацэ рыбы, плавалі цінай?
Ці-ж не ваша адважная колісь дружына,

Маўляў туры, рыкае ў няведамым полі,
Гартаванымі шаблямі ранена ў волю?

Уступіце, сябры, у залатыя страмёны
За ўсю крыўду вялікую часаў сягонных

І за Рускую зямлю, за Ігара раны,
Святаславіча буйнага—здзекі ў паганых.

Яраславе Осмомысле Галіцкі! Кутам
На пасадзе высока сядзіш златакутым.

Ты сваімі палкамі жалезнымі ўвышы
Падпёр горы угорскія, шлях заступіўшы

Каралю, й, зачыніўшы вароты Дунаю,
Цераз воблак шыбаючы берамы з краю,

Да Дуная суды свае судзячы спраўна!
Твае грозьбы па землях цякуць многаслаўна!

Адчыняеш ты Кіеву насцеж вароты
Ды з свайго залатога пасаду адно ты

Султаноў за зямлямі страляеш няслаба.
О, страляй, княжа, ў сэрца паганага раба

Канчака за зямлю Русь, за Ігара раны,
Святаславіча буйнага—здзекі ў паганых!

А ты, буйны Рамане, і ты, Імсціславе!
Думка храбрая носіць ваш розум па справе,

Плывіцё вы на справу з адвагай, высока,
Быццам сокал на ветрах, лунаючы лёгка.

Птаха хочачы сходаць у бітвах з вятрамі,
Ёсць бо ў вас пад лацінскімі йшчэ шаламамі

І з жалеза наперснікі, з іхняга звону
Ўжо затрэсліся землі й шмат розных старонаў—

Палаўчане, Хінова, Літва, Дарамела, яцвягі,—
Свае кінулі ў полі і дзіды і сцягі

І галовы свае нахілілі пад тыя
Вашы, князі, магутныя мечы стальныя.

Але ўжо, княжа Ігар, бліск сонца сцямніла,
Не на добрае й дзерава лісць свой згубіла!

Во па Русі й Суле гарады падзялілі.
А ўжо Ігара войска не ўскрэсіць у сіле!

Дон цябе, княжа, кліча, ждучы твайго следу,
І князёў заве іншых к сабе на пабеду.

Во храбрыя князі Ольговічы,—у бойцы
Непамернай таей утаміліс малойцы.

Усяволад, Інгвар, Імсціславічы ўсе тры!
Не благога гнязда птахі хованы ў ветры,—

Сабе ўладу не ў шчасціж пабедным прыдбалі?
Залатыя ў вас шоламы што заняпалі?

Што замоўклі ў вас ляцкія дзіды з шчытамі?
Полю загарадзіце вароты стралами

Вы за Рускую зямлю, за Ігара раны,
Святаславіча буйнага—здзекі ў паганых!

IX

Ўжо бо Сула не цячэ ручаінай
К Пераяслаўлю быстрай, срабранай;
Дзвіна ўжо балотам цячэ безупыну
Да палачан, пад воклік паганаў.

Адзін Ізяслаў толькі, сын Васільковы,
Сам пазваніў мячамі сваімі
Аб шлемаў літоўскіх стальныя аковы,
Ускалыхнуўшы днямі былымі.

Свайму пераняў славу дзеду Ўсяславу,
Сам пад чырвоным шчытам пабіты
Мячамі літоўскімі, лёг на крывавай
З Хоццем траве. А кажа тады той:

«Дружыну тваю апранулі, князь, крыллем
Птахі, а зверы кроў палізалі!»

Не быў тут брат Брачыслаў. над кавылем,
А ні другі—Ўсяволад. У жалі

Адзін ён жамчужную з храбрага цела
Выпусціў душу праз ажарэлле.
Заныла гамонка, вясёласць знямела,
Трубы ў Гародні смутна запелі.

Яраславе і ўнукі вы ўсе Усяслава!
Апусціце ўжо сцягі свае,
Пахавайце мячы пашчарбаны, бо слава
Ужо дзедава вас не спаўе!

Вы бо сваркай сваёй напусцілі
Скрозь паганых па Рускай зямлі,
Па надзеле Ўсяслава, з чаго і насіллі
Ад зямлі Палавецкай пайшлі.

У сёмы Траянавы век
Уздумаў Ўсяслаў варажыць
Аб мілай дзяўчыне сабе,
Што з славай яго заручыць.

Пусціўшыся ў хітрыкі, ён
На борздага ўсеўся каня
І скочыў, памчаўся чым свет
Да Кіева-грода, дадня.

І кіеўскі дзідаю там
Пасад дакрануў залаты;
Ад іх скочыў зверам лютым
З Белгарада ў поўнач; тады

Ахутаўся сіняю мглой,
А раннем, узняўшысь да зор,

Навограду браму лязом
Сякераю насцеж адпёр.

Разбіў Яраслававу там
Прыдбаную славу мячом
І скочыў праз поле і лог
К Нямізе з Дудутак ваўком.

На Нямізе снапы сцелюць
Галавамі,
А малоцяць-жа стальнымі
Іх цапамі.

На таку жыццё кладзецца
Неспадзейна,
І душу ад цела веюць
Безнадзейна.

Берагі ў крыві Нямігі
Па калені;
Не дабро на іх пасеяў
Сейбіт жменяй.

А былі яны гусценька
Ў процьмах вузкіх
Там засеяны касцямі
Сыноў рускіх.

Усяслаў князь людзям суд судзіў,
Гарадамі князёў надзяляў,
А сам поначы, свету на здзіў,
Ваўкалакам ці воўкам гуляў.

Ён бо з Кіева да пятухоў
Горад Тмутаракань дасцігаў

І вялікаму Хорсу без слоў
Воўкам шлях борзда перабягаў.

Таму ў Полацку рана званы
Пазванілі ў Сафеі святой
Да завутрані,—ён-жа праз сны
Ужо ў Кіеве звон чуе той.

Хоць і вешчая, кажуць, душа
Ў дзёрзкім целе ягоным была,
Але часта бяды без нажа
Нацярпеўся, што доля дала.

Яму першаму вешчы Баян
І прыпеўку дасціпна злажыў:
«Хітры, быстры, ні птах той быстран
Суду божага не паражыў!»

О, стагнаці ўжо Рускай зямлі,
Як успомніць князёў з былых пор!
Уладзімера таго не маглі
Прыкаваці да кіеўскіх гор.

А цяпер яго сцягі нішто:
Адны Рурыку славу шумяць,
А другія—Давідавы ўжо...
Але стужкі іх розна вісяць.

X

Пяюць дзіды на Дунаі,
А ў Пуціўлі Яраслаўна
Безуцешнаю зязюляй
Наракае раным-рана:

«Паляту я ўдаль зязюляй
Па Дунаю за дубровы,
Памачу ў рацэ-Каяле
Рукавок я свой бабровы.

«І зляту да князя ў полі,
Дзе ў зялёнай лёг пасцелі,
Ды крывавыя ўтру раны
На яго магутным целе».

Яраслаўна рана плача
У Пуціўле на сцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:

«О, вецер, вятрыска!
Чаму, ўладар, лётам
Сваім гэтак вееш
У вочы сіротам?

«Чаму ты на крыллях—
І вольны і смелы—
На мужніх ваякаў
Мчыш ханскія стрэлы?

«Ці-ж веяці мала
Табе пад аблокі—
Угары, ў паднябессі
Шырокім, далёкім?

«Або ў сінім моры
Лялеяць, гайдаці
Чаўны з караблямі
Да ціхае гаці?

«Чаму ты, ўладару
Мне радасць асіліў,
Вясёласць развеяў
Па дзікім кавылі?»

Яраслаўна рана плача
У Пуціўлі на сцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:

«О, Днепра Славуціч!
Ты ў каменных горах
Праз полаўцаў землі
Дол высек у мора.

«Кабякаву войску
Чаўны Святаслава
Сабой ты лялеяў,
Акрылены славай.

«О, мне прылялей-жа,
Ўладару, ў харомы
Саколіка-мужа
З зямлі незнаёмай!

«Каб слёзаў я рана
Ў тузе небывалай
К яму цераз поле
На мора не слала!»

Яраслаўна рана плача
У Пуціўлі на сцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:

«О, светлае сонца,
Трысветлае! Усюды
Цяплом і красою
Яснееш, як цуды.

«Чаму-ж, уладару,
Свой промень пякучы
На мужнае войска
Нанесла, не ждучы?

«На полі бязводным
Ты смагай пагнула
Ім лукі, а тугай
Заткала ўтулы?!»

XI

Пырснула мора на поўнач,
Смерчы ідуць чарадой;
Ігару князю дарогу
Знача бог чорнаю мглой.

Знача з зямлі Палавецкай
Шляхі да Рускай зямлі,
Дзе жджэ на Ігара доўга
Бацькаў пасад дарагі.

Патухла вячэрняя зорка.
Князь Ігар і спіць, і не спіць—
Ад Дона вялікага думкай
Да Донца малога бяжыць.

Апоўначы свіснуў савою
Аўлур на каня за ракой,

Уцяміць загадвае князю,
А Ігар князь знікнуў, як стой.

Той клікнуў—зямля загручэла;
Трава зашумела быллём;
Упуд палавецкія вежы
Спалохаў, зварушыў жыллём.

А князь Ігар ужо гарнастаем
Паскакаў па траве к трыснягу,
На вадзе выплыў гогалем белым,
На каня узваліўся ў бягу.

І саскочыў з яго босым воўкам,
Пакаціўся да логу Данца,
Й паляцеў сакалом пад імгламі,
Забіваючы там без канца

На снеданне, абед і вячэру
Белых лебедзяў, шэрых гусей.
Як ляцеў сакалом гэтак Ігар,
Тады воўкам Аўлур з сілы ўсёй

Пакаціўся, сцюдзёныя росы
Абтрасаючы вокал сабой.
Коні быстрых сваіх падарвалі,
Летучы пуцявінай пустой.

І кажа рака Донец: «Ігару княжа!
Не мала во бітвы далі
Вялічча табе, а Канчаку дакукі,
А радасці Рускай зямлі!»

А Ігар князь кажа: «О, Донча! Не мала
Вялічча сабе ты прыдбаў,

Што князя на хвалях лялеяў і шчыра
Зялёну траву падсцілаў

«Яму на сваіх берагах серабраных,
Ї цёпла атуліваў мглой
Пад ценем зялёнага буйнага дрэва,
Ды пільна сцярог з цемнатой

«Яго на вадзе сваёй гогалем белым,
А чайкай паверх ручаёў,
Ды качкай-чарнедзяй на ветрах шумлівых
Паказываў сцежку і вёў.

«А Стугна, рака ўжо куды не такая,
Худы бо ў яе перацёк;
Чужыя папіўшы, глынуўшы крыніцы
Ї хвалі разліўшы, дзе ўток,

«Яна маладому князю Расціславу—
Без часу і не на дабро—
Пры беразе цёмным наскрозь зачыніла
Дарогу сабой на Дняпро.

«Тужыць Расціслава маці і плача
Па князі сваім маладым...
А кветкі занылі, а дрэва са смуткам
К зямлі пахілілась благім»...

Ой, не сарокі ўстракаталі!
А гэта Їгаравым следам
Гза з Канчаком упобач едзе,
Як па жніво сусед з суседам.

Тады ўжо груганы над косцьмі
Не грумкалі, і галкі змоўклі,

Не сакаталі і сарокі,
Па лозах распаўзліся, моклі...

Па лесе тукатам няўтомным
След дзятлы к рэчцы адбіваюць,
А салаўі вясёлай песняй
Блізкае ранне выйгрываюць.

І гаворыць так Гза Канчаку:
«Калі сокал ляціць у гняздо,
Залатымі страламі сваімі
Мы застрэлім сакольца яго!»

А Канчак-жа адказвае Гзе:
«Калі сокал ляціць да гнязда,
Краснай дзевай сакольца тады
Мы апутаем,—што за наўда!»

А Гза кажа на то Канчаку:
«Калі дзеваю краснай яго
Мы апутаем, то ўжо тады
Мець не будзема мы ні таго

«Маладога сакольца ў сябе,
А ні краснае дзевы, ды нас
На палях палавецкіх пачнуць
Кляваць птахі ў нявеселы час!

XII

І сказаў-жа аб днях Святаслава
Той Баян-песнятворца старын
І далёкай пары Ярослава
І Олегавых даўных часцін:

«Хоць і цяжка табе, многасмелай
Галаве, без плячэй у людзях,
Але трудна й табе жыці, целу,
Без сваёй галавы на грудзях!»

Так і Рускай зямлі ненарокам
Цяжка мераць без Ігара дні.
Сонца свеціць на небе высокім.
А князь Ігар на Рускай зямлі.

Красны дзевы пяюць на Дунаю,
Галасы іх плывуць і лятуць
Неўгамонна ад краю да краю,
Цераз мора да Кіева йдуць.

Ігар едзе праз спуск Барычоўскі
К абразу Пірагошчы святой.
Рады князю староны і вёскі,
Гарады весяляцца з сабой.

Пеўшы песню старым князям, справам,
Потым пець маладым песняй бур:
Святаславічу Ігару слава!
Слаўся, храбры Усявалад буй тур!

І Ўладзімер, сын Ігара воя,
Малады князь—на страх палаўчан!
І князям і дружыне здароўя,
Выступаючым за хрысціян,

У няведамай дзікай краіне,
Пашматаўшы паганых палкі.
Слава буйным князям і дружыне
На далёкія векаў-вякі!»

З М Е С Т

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

СЛОВО О ПОЛКУ ИГОРЕВЕ

Государственное Издательство Белоруссии

Минск — 1938

Рэдактар *М. Лынькоў*
Мастацка-тэхнічнае афармленне
М. Фельдман
Карэктар *Л. Касцюковіч*

★

Здана ў друкарню 11/IV-38 г.
Падпісана да друку 17/V-38 г.
Аб'ём $5^1/_4$ друкаваных аркушоў
Папера $72 \times 108/_{16}$.
Тыраж 6000 экз. Заказ № 273.
Уп. Галоўлітбела № Б 641.
Знакаў у друк. аркушы 31680.

Набіралася і друкавалася ў друкарні Акадэміі навук БССР.
Пераплёт друкарні імя Сталіна. Г. Менск.



